**Сёння ў нумары:**

● НА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ

● СЛОВА ДА БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

● ГУТАРКА З ВЫПУСКНІКАМІ

● ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ ГІСТОРЫЮ

● НА ЗЯМЛІ РЭСПУБЛІК-СЯСЦЁР

● РАПАРТУЕ «УНІВЕРСАЛ-73»

● НА СТАРТ ВЫХОДЗІЦЬ УНІВЕРСІЯДА

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 26 (159) | Субота, 22 верасня 1973 г. | Газета выходзіць з верасня 1969 года | Цана 2 кап.

## У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта ўніверсітэта разгледжаны надзённыя пытанні. Партком зацвердзіў графік правядзення справаздачна-выбарчых сходаў у партыйных групах і пярвічных партыйных арганізацыях. Зацверджана таксама сістэма партыйнай вучобы ў падраздзяленнях ГДУ.

Намеснік сакратара партыйнага бюро фізічнага факультэта Т. П. Жалонкіна і сакратар партбюро эканамічнага факультэта Н. В. Волкава выступілі з інфармацыйным паведамленнем аб ходзе падпіскі на перыядычныя выданні 1974 года на гэтых факультэтах.

Абмеркаван і зацверджан план па падрыхтоўцы і правядзенню 30-годдзя з дня вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аб выніках работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў у трэцім, працоўным семестры гаварыў на пасяджэнні парткома намеснік сакратара камітэта камсамола Я. М. Бабічаў.

*Фотарэпартаж*

# ПАКЛІКАЛА ПОЛЕ

**Працаўнікі сельскай гаспадаркі вобласці вырасцілі сёлета багаты ўраджай бульбы. Яе ўборка — адна з самых працаёмкіх работ, патрабуе шмат рук. Таму студэнты нашага ўніверсітэта, як і ў папярэднія гады, цяпер аказваюць пасільную дапамогу калгаснікам і рабочым саўгасаў на бульбяных палетках. У шасці раёнах Гомельшчыны працуе зараз каля дзвюх тысяч юнакоў і дзяўчат ГДУ.**

**Днямі наш фотакарэспандэнт Анатоль Рудчанка пабываў у саўгасе «Кармянскі» Кармянскага раёна. Гэты фотарэпартаж — вынік яго камандзіроўкі.**

**На ўборцы бульбы ў саўгасе працуе чатыры групы гісторыка-філалагічнага факультэта. Рабятам даводзіцца нялёгка, але яны стараюцца заслужыць шчырую падзяку хлебаробаў, прыкладаюць шмат сіл, каб штодзённа выконваць нормы выпрацоўкі.**

**Па-ўдарнаму, з камсамольскім агеньчыкам працуюць у гэтыя дні чацвёртакурснікі Аляксандр Касалапаў і Леанід Машэўскі (на верхнім здымку). Для таварышаў яны паказваюць добры прыклад.**

**На ўборцы «другога хлеба» шырока прымяняецца і тэхніка. Надзя Сіманенка, Тамара Нікрашэвіч і Тамара Цімафеева працуюць па бульбаўборачным камбайне (ніжні здымак). Дзяўчаты таксама стараюцца, з іх удзелам за дзень накопваецца да 23 і больш тон клубняў.**

**На транспартыроўцы каштоўнай культуры ніводнай мінуты прастою не ведаюць саўгасныя аўтамашыны. У гэтым заслуга тых рабят, якім даручаны пагрузачна-разгрузачныя работы.**

**Вось якая буйная бульба вырасла на саўгасных палетках! (На здымку—злева).**







## ЗА АБАРОННА-МАСАВУЮ РАБОТУ

Пярвічны калектыў ДТСААФ Гомельскага ўніверсітэта — адзін з лепшых у вобласці. Ён заваяваў права ўдзельнічаць у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе абаронна-масавай работы, які прысвячаўся 50-годдзю ўтварэння СССР і Дню савецкай моладзі, і дабіўся поспеху. Нядаўна аргкамітэт падвёў вынікі гэтага агляду-конкурсу і прысудзіў калектыву ДТСААФ універсітэта другое месца з уручэннем адпаведнай прэміі.

Цэнтральны камітэт ДТСААФ Беларусі за добрую пастаноўку абаронна-масавай работы ва ўніверсітэце ўзнагародзіў групу актывістаў яго пярвічнай арганізацыі знакамі і граматамі.

## ВІНШУЕМ!

**Прафесарска-выкладчыцкі састаў і студэнты ўніверсітэта горача віншуюць загадчыка кафедры псіхалогіі і педагогікі ХАРЛАМАВА Фёдара Іванавіча з выпадку прысваення яму вучонай ступені доктара педагагічных навук.**

* * *

**Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў эканамічнага факультэта віншуе старшага выкладчыка, намесніка дэкана КЕКІША Івана Кірылавіча з атрыманнем ад Вышэйшай атэстацыйнай камісіі дыплома кандыдата эканамічных навук.**

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# НАБЫВАЙЦЕ ГРАМАДСКІЯ ПРАФЕСІІ

...«Студэнцкая пара — гэта не толькі падрыхтоўка да заўтрашняга дня, не проста чаканне яго, — сказаў на Усесаюзным злёце студэнтаў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў. —Гэта ўжо сёння яркае, змястоўнае жыццё. Гэта напружаная, творчая праца, актыўная грамадская работа».

Што можа зрабіць у гэтай сувязі камсамольская арганізацыя ўніверсітэта? На якія моманты ў сваёй дзейнасці яна павінна звяртаць асаблівую ўвагу?

Па-ранейшаму нашым асноўным клопатам застаецца барацьба за глыбокія веды будучых спецыялістаў. Сучасны ўзровень развіцця навукі і тэхнікі патрабуе кадраў самай высокай адукацыі, культуры і эрудыцыі. Немагчыма ў поўным сэнсе слова стаць добрым спецыялістам, калі вучыцца пасрэдна і заставацца ў баку ад шматграннага грамадскага жыцця. З такога студэнта патрэбнага для краіны спецыяліста не атрымаецца.

Цяпер нават недастаткова дасканала ведаць сваю спецыяльнасць. Сучаснаму маладому спецыялісту патрэбна актыўна ўдзельнічаць у выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце. Для гэтага трэба зрабіць марксісцка-ленінскае вучэнне сваім светапоглядам, каб можна было паспяхова весці барацьбу з буржуазнай ідэалогіяй. Глыбока засвоіць марксізм-ленінізм можна толькі пры ўмове творчага самастойнага вывучэння твораў Маркса, Энгельса, Леніна, матэрыялы КПСС і міжнароднага камуністычнага і рабочага руху.

Сучасны малады спецыяліст, дзе б ён ні працаваў, гэта яшчэ і лектар, і прапагандыст, і арганізатар многіх карысных спраў. Дык дзе, як не ў ВНУ, набыць гэтыя якасці?

Пры нашым універсітэце працуе школа маладога лектара. Тут у адной з чатырох секцый — грамадска-палітычнай, эканамічнай, атэістычнай і прыродазнаўчых навук — можна прайсці добрую практыку, удасканаліць сваё лектарскае майстэрства. Лекцыі слухачоў школы маладога лектара з вялікай цікавасцю ўспрымаюць у кожным працоўным калектыве, у асяроддзі моладзі.

Вельмі добра, калі малады спецыяліст здольны арганізаваць работу гурткоў мастацкай самадзейнасці, сам актыўна ўдзельнічае ў ёй. Тут таксама патрэбны адпаведныя навыкі. У нашым універсітэце іх можна набыць на рэпетыцыях у клубе мастацкай самадзейнасці, у тэатры мініяцюр. Тут ёсць магчымасць развіваць свае задаткі ў многіх жанрах народнага мастацтва.

У наш час неабходны грамадскія інструктары, трэнеры, суддзі па спорту, інспектары па ахове прыроды і г. д. І ва ўніверсітэце праводзіцца значная работа, каб кожны студэнт разам з асноўнай набываў грамадскія прафесіі. Цяпер можна прывесці шмат прыкладаў, якія сведчаць аб тым, што былыя выпускнікі ГДУ паспяхова спалучаюць сваю працу з грамадскай дзейнасцю, заслужылі за гэта аўтарытэт і павагу.

Тым не менш нас яшчэ не можа задавальняць узровень падрыхтоўкі студэнтаў грамадскім прафесіям. Ён павінен быць значна вышэйшым. На гэта павінна накіраваць свае намаганні кожная пярвічная арганізацыя ўніверсітэта.

**А. ЛЯЛЬКОВА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола.**

# НА СТАРЦЕ—ПЯТАЯ ЎНІВЕРСІТЭЦКАЯ

У мэтах масавага аздараўлення студэнтаў, аспірантаў, супрацоўнікаў універсітэта і далучэння іх да рэгулярных заняткаў фізкультурай і спортам, падрыхтоўкі і здачы норм новага Усесаюзнага фізкультурнага комплекса ГПА, павышэння майстэрства спартсменаў праўленне спартыўнага клуба, кафедра фізічнага выхавання, камітэт камсамола, прафком і мясцком прынялі сумесную пастанову аб правядзенні з 1 кастрычніка 1973 па 15 мая 1974 года V круглагадовай універсіяды.

Зацверджаны палажэнне аб універсіядзе, арганізацыйны камітэт і галоўная судзейская калегія.

### САСТАЎ КАМІТЭТА ПА ПРАВЯДЗЕННЮ V КРУГЛАГАДОВАЙ УНІВЕРСІЯДЫ

БОКУЦЬ Б. В. — рэктар, старшыня аргкамітэта.
СЕЛІВАНАЎ В. І. — старшыня спортклуба, нам. старшыні аргкамітэта.
СЕМІКОП А. Ф. — дэкан факультэта фізвыхавання, нам. старшыні аргкамітэта.
БУДЗЮХІН І. Д. — заг. кафедры фізвыхавання, нам. старшыні аргкамітэта.
ЧАБАТАРОЎ Б. А. — старшыня абласнога савета СДСТ «Буравеснік», нам. старшыні аргкамітэта.

### ЧЛЕНЫ АРГКАМІТЭТА:

ТРАЦЭЎСКІ І. П. — дэкан эканамічнага факультэта.
СТАРЫКАЎ У. М. — дэкан фізічнага факультэта.
ПАЛЯКОЎ Л. А. — дэкан механіка-матэматычнага факультэта.
ЯЗЭПАВА Т. І. — дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта.
АЛЕШКА С. Ф. — дэкан біёлага-глебавага факультэта.
ХАДАКОЎСКІ Ю. Ф. — дэкан геалагічнага факультэта.
ІЛЬЯНКОВА Т. І. — сакратар камітэта камсамола.
БОГУШ А. У. — старшыня прафкома.
БАЙДА М. Л. — прарэктар па АГЧ.
ДАДЗІЁМАВА М. І. — галоўны ўрач медпункта ГДУ.

### САСТАЎ СУДЗЕЙСКАЙ КАЛЕГІІ V УНІВЕРСІЯДЫ

Галоўны суддзя — ПАЛЯКОЎ Л. А., суддзя Рэспубліканскай катэгорыі, дэкан механіка-матэматычнага факультэта.
Нам. галоўнага суддзі — ТАЛСТАПЯТАЎ М. П. — суддзя Усесаюзнай катэгорыі, заслужаны трэнер БССР, майстар спорту.
Нам. галоўнага суддзі — ДАДЗІЁМАВА М. І., галоўны ўрач медпункта.
Галоўны сакратар — ГРЫШАЧКІН А. Р., суддзя Рэспубліканскай катэгорыі.
Нам. галоўнага сакратара — ЗАКРЭЎСКАЯ Г. П., суддзя 1-ай катэгорыі.

**БАСКЕТБОЛ:**

Галоўны суддзяў — ЦАРЫКАЎ Б. А., суддзя Усесаюзнай катэгорыі.
Галоўны сакратар — САКОВІЧ П. П., суддзя 1-ай катэгорыі.

**ВАЛЕЙБОЛ:**

Галоўны суддзя — ЗАЙЦАЎ Б. М., суддзя 1-ай катэгорыі.
Галоўны сакратар — БОРСУК А. П., суддзя 1-ай катэгорыі.

**СПАРТЫЎНАЯ ГІМНАСТЫКА:**

Галоўны суддзя — АРХІПАЎ А. В., майстар спорту, суддзя Рэспубліканскай катэгорыі.
Галоўны сакратар — РЫБАКОВА Л. Ф., суддзя 1-ай катэгорыі.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА:**

Галоўны суддзя — КІРЭЕЎ В. К., суддзя Усесаюзнай катэгорыі.
Галоўны сакратар — ТРАФІМОВІЧ І. Р., суддзя 1-ай катэгорыі.

**ПЛАВАННЕ:**

Галоўны суддзя — ВОЛКАЎ Д. І., суддзя Рэспубліканскай катэгорыі.
Галоўны сакратар — ГІЛЬ Б. М., суддзя 1-ай катэгорыі.

**ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС (вясенні):**

Галоўны суддзя — САВЕНКА А. М., майстар спорту, суддзя Рэспубліканскай катэгорыі.
Галоўны сакратар — ПРЫХОДЗЬКА С. М., суддзя 1-ай катэгорыі, майстар спорту.

**ФЕХТАВАННЕ:**

Галоўны суддзя — ЛІСОЎСКІ В. В. — майстар спорту, суддзя Рэспубліканскай катэгорыі.
Галоўны сакратар — ЭЛЛЕ Т. К., суддзя 1-ай катэгорыі.

**ЛЫЖНЫ СПОРТ:**

Галоўны суддзя — СЫРАДОЕЎ Ф. Я., суддзя 1-ай катэгорыі.
Галоўны сакратар — МАРОЗАВА Л. М., суддзя 1-ай катэгорыі.

**МНАГАБОРСТВА ГПА (зімовае):**

Галоўны суддзя — КІЛЬЧЭЎСКІ В. Е., майстар спорту, суддзя 1-ай катэгорыі.
Галоўны сакратар — СЯМЁНАЎ С. П., майстар спорту, суддзя 1-ай катэгорыі.

**ЗАЎВАГА:** астатнія матэрыялы аб V універсіядзе будуць змешчаны ў наступных нумарах нашай газеты.

«ФОТАКОНКУРС-73»



ПЕРШАКЛАСНІЦА.

Фота студэнткі V-га курса механіка-матэматычнага факультэта А. КАСТРЫЦКАЙ.

## АБАРАНЯЮЦЬ ГОНАР ВОБЛАСЦІ

Нядаўна стартавала другая спартакіяда «Дружба» — Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей.

Зборныя каманды Гомельшчыны ў асноўным укамплектаваны спартсменамі нашага ўніверсітэта.

У Бранску першынство аспрэчвалі валейбольныя каманды. Сярод жанчын перамогу атрымалі гамяльчанкі.

У спартыўнай зале нашага ўніверсітэта напружана праходзілі паядынкі баскетбалістаў. Гаспадары пляцоўкі перамаглі спартсменаў Чарнігава—70:49, Бранска — 70:46 і заваявалі першынство.

Перамогу над сваімі саперніцамі святкавалі і нашы баскетбалісткі. У чарнігаўскіх дзяўчат яны выйгралі з лікам 60:54, у бранскіх — 63:22.

## ПЕРШАЯ ЧЭМПІЁНКА

На гэтым тыдні ў Мінску быў праведзены адкрыты чэмпіянат рэспублікі па ваенна-прыкладному мнагаборству. Зборная каманда Гомельшчыны была ўкамплектавана спартсменамі ўніверсітэта. У яе састаў уваходзілі майстры спорту Уладзімір Касабукін, Барыс Малашанка, Валянціна Максіменка, перспектыўны першаразраднік Аляксандр Кузьменка і іншыя здольныя спартсмены.

З выдатным вынікам фінішавала член зборнай каманды рэспублікі В. Максіменка. Паўтаракіламетровую дыстанцыю, на якой з 25-метровай адлегласці трэба было гранатай папасці ў цэль і з 50-метровай — паразіць з малакалібернай вінтоўкі пяць мішэняў, Валянціна пераадолела з лепшым вынікам — 7 мін. 31 сек. У гэтым відзе яна ўпершыню стала чэмпіёнкай рэспублікі.

Поспех развіў юны Аляксандр Кузьменка. Ён паказаў лепшы вынік у бегу на 2000 м з метаннем гранат і стральбой.

Выдатна выступіла каманда гамяльчан у камбінаванай эстафеце, у якой удзельнічалі мужчыны, жанчыны і юнакі. Станіслаў Газаран, Барыс Малашанка і Валянціна Максіменка паказалі лепшы вынік — 5 мін. 18 сек.

Аб накале барацьбы сведчыць той факт, што пасля двух дзён спаборніцтваў тры каманды — Мінскай, Гомельскай і Віцебскай абласцей — мелі аднолькавую колькасць ачкоў.

Пераможца ў агульным заліку вызначаўся на агнявым рубяжы. Гамяльчане паспяхова правялі спаборніцтвы па стральбе і здолелі апярэдзіць сваіх грозных сапернікаў, а разам з гэтым заваявалі пераходны кубак ЦК ДТСААФ Беларусі.

І. КУЛЬЧЫЦКІ.





Узмоцнена рыхтуюцца да VIII-ай зімовай спартакіяды БССР канькабежцы нашага ўніверсітэта.

На здымках: злева — старшы выкладчык, трэнер па канькабежнаму спорту Альберт Іосіфавіч Гружноў са сваімі выхаванцамі; справа — спартсмены на трэніроўцы.

# І СМЕХ І ГРЭХ



(з сачыненняў абітурыентаў-73)

- Рахметов скитался по России разными манерами: и сухим путем, и водою, и пешком, и на лодках.
- Стихи меня захватили и поволокли куда-то, в потоке солнечных лучей его поэзии.
- За эти 10 лет я очень много прочла стихотворений русских поэтов. Но в особенности влез в душу С. Есенин.
- В романе показаны маскировочные люди — кулаки.
- Для Пушкина не нужно было ехать за границу, чтобы искать там своё вдохновение.
- Онегин и Ленский были соратниками в любви.
- После дуэли Онегина с Ленским, Ленский был убит.
- Ольга Ларина — девушка лёгкого поведения.
- Татьяна Ларина любила до рассвета читать заграничные романы.
- Любовь к книгам у меня начала привеваться с третьего класс.а
- Руками нашего учёного Курчатова был расщеплен атом.
- Многие идут за мечтою и за запахом тайги, но долго не выдерживают.
- Павка любит Таню, но она не оправдала его любовь.
- Наташа Ростова увлекалась азартными играми.
- Для поэзии Некрасова характерна особая калорийность.
- Мы должны высоко держать знамя, поднятое нашими отцами, бабушками и дедушками.

**Сабралі выкладчыкі ўніверсітэта Л. Цэхановіч, Л. Яцкевіч, Л. Няронская, Л. Кудраўцава.**

# ПЕРАМОЖЦЫ КРОСА

На ўскраіне Гомеля прайшоў фінал абласнога прафсаюзна-камсамольскага лёгкаатлетычнага кроса. У ім прыняла ўдзел група мацнейшых спартсменаў нашага ўніверсітэта.

Вялікага поспеху дабілася майстар спорту З. Гразева. Яна — бягуння на кароткія дыстанцыі, але на гэты раз у інтарэсах каманды выступала на двухкіламетровай. Здольная спартсменка і тут заракамендавала сябе з лепшага боку, упэўнена заваявала перамогу з вынікам 12 мін. 37 сек.

На дыстанцыі 5000 м перамог адзін з мацнейшых красменаў рэспублікі студэнт ГДУ У. Якутовіч. Яго вынік — 14.47,0.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 33994. «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат — 420×300 мм. Тыраж 2000 экз. Зак. 5386.